# Прафарыентацыйная дзейнасць факультэта журналістыкі БДУ як эфектыўны рэсурс медыяадукацыі

**Г. І. Басава,**
прафесар кафедры тэхналогій камунікацыі і сувязей з грамадскасцю факультэта журналістыкі,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

*Паспяховая падрыхтоўка высокакваліфікаваных, канкурэнтаздольных спецыялістаў немагчыма без наяўнасці адпаведнай сістэмы суправаджэння прафесійнага самавызначэння, якая ахоплівае ўсе ўзроўні адукацыйнай сістэмы і рэалізуецца праз эфектыўныя прафарыентацыйныя практыкі [1, с. 46]. Прафесійнае самавызначэнне – адзін з самых важных этапаў у жыцці кожнага чалавека. І на гэтым этапе вялікае значэнне мае скаардынаванае ўзаемадзеянне дзяржаўных устаноў адукацыі (сярэдніх і вышэйшых), дзяржавы ў цэлым, моладзі, бацькоў [2, с. 33].*

Сучасная прафесійная арыентацыя – гэта самастойная галіна ведаў, якая ўяўляе сабой сінергію такіх навук, як псіхалогія, педагогіка, сацыялогія, медыцына, права, эканоміка, і якая дапамагае выбару ў адпаведнасці са здольнасцямі, цікавасцямі, схільнасцямі чалавека. Адным з суб'ектаў прафарыентацыйнай дзейнасці выступае ўстанова вышэйнай адукацыі, яе факультэты. У апошнія гады даволі эфектыўнай аказалася практыка прафарыентацыйнай дзейнасці факультэта журналістыкі БДУ, якая рэалізуецца праз разнастайныя і шматлікія праекты, акцыі, напрамкі і мерапрыемствы, накіраваныя на выяўленне творчых якасцей асобы, замацаванне ў навучэнцаў школ, гімназій, ліцэяў цікавасці да будучай прафесіі, забеспячэнне самавызначэння асобы, стварэнне ўмоў для яе самарэалізацыі.

Журналістыка – спецыфічная сфера духоўна-практычнай дзейнасці чалавека, і, уваходзячы/уключаючыся ў яе (у дадзеную галіну), ён найперш спрабуе рэалізаваць свой творчы пачатак [3, с. 6]. Яна патрабуе шмат ведаў у розных галінах. Але самае галоўнае ў гэтай прафесіі – талент. Раскрыць яго яшчэ ў школьным узросце дапамагаюць на факультэце журналістыкі БДУ, дзе профільнае навучанне асновам журналісцкай дзейнасці на этапе дапрафесійнай падрыхтоўкі шмат у чым выйграе, дазваляючы на дастаткова высокім узроўні падрыхтаваць школьнікаў да асэнсаванага і ўсвядомленага выбару будучай прафесіі, а таксама да паступлення на факультэт. Яна ўяўляе сабой развіваюча-адукацыйную прастору, дзе рэалізуюцца творчыя магчымасці навучэнцаў для іх прафесійнага самавызначэння і творчага станаўлення ў сістэме сацыякультурных сувязей сучаснага грамадства [4, с. 119]. Як слушна адзначае дэкан факультэта журналістыкі БДУ А. В. Бяляеў, «журналіст – гэта чалавек са знакам якасці. Чалавек, у якога не проста ёсць работа, а ёсць місія, якая выходзіць за рамкі паўсядзённай дзейнасці. Па сутнасці, мы рыхтуем інфармацыйную эліту. Сёння прафесія журналіста – прафесія кшталту ваеннаслужачых,

чыноўнікаў, прафесія, якая патрабуе не работы, а служэння. Працуюць на заводзе, а ў журналістыцы, як і ў арміі, служаць. Служаць краіне і свайму народу» [5].

Факультэт журналістыкі – гэта творчы факультэт. Таму здольнасці да журналістыкі, пэўныя ўменні і навыкі навучэнцы школ, гімназій, ліцэяў выяўляюць ужо задоўга да паступлення, удзельнічаючы ў акцыях, праектах, арганізаваных факультэтам, такіх як праект «Школа маладога журналіста» і яго напрамкі: «Курс на журфак», «На хвалі з абітурыентам», «Канікулы на журфаку», «Тыдзень з журфакам», «Студэнт БДУ на тыдзень», «Уваходжанне ў навуку», «Дзень дзіцячай журналістыкі», «Журфак вітае», форум адоранай моладзі «Наша будучыня», разнастайных аглядах, выставах і конкурсах творчых работ (рэспубліканскія конкурсы «Старт», «TVR», «БрамаМар»), у дыялагічных і дыскусійных пляцоўках на базе факультэта і іншых структур, у майстар-класах вядомых журналістаў і інш. Гэта дае магчымасць навучэнцам атрымаць вопыт творчай дзейнасці непасрэдна ў атмасферы факультэта ў асяроддзі выкладчыкаў, вядомых медыйных асоб, а таксама студэнтаў («Канікулы на журфаку», «Тыдзень з журфакам», «Дзень дзіцячай журналістыкі»), далучыцца да студэнцкага («Студэнт БДУ на тыдзень») і навуковага («Уваходжанне ў навуку») жыцця, падрыхтавацца да паступлення (падрыхтоўчыя курсы па дысцыпліне «Творчасць», дзе заняткі праводзяцца як на працягу навучальнага года ў вочнай, завочнай і з выкарыстаннем ІКТ формах, так і ў форме двухтыднёвых кароткатэрміновых курсаў, а таксама паглядзець відэакансультацыі да ўступнага экзамену ад выкладчыкаў факультэта, якія размяшчаюцца на сайце факультэта і на яго YouTube-канале, падрыхтаваць публікацыі для партфоліа, неабходнага для паступлення, якое складаецца з матэрыялаў абітурыентаў, размешчаных у СМІ, і на інтэрнэт-рэсурсах факультэта «Studlive.by» і «Вэб-журналіст») і інш.

Прафарыентацыйная дзейнасць на факультэце журналістыкі БДУ найперш скіравана на рэалізацыю праектаў «Школа маладога камунікатара» (далей – ШМК) і «Школа маладога журналіста» (далей – ШМЖ), навучэнцамі якіх з'яўляюцца вучні 9–11 класаў дзяржаўных устаноў адукацыі (далей – ДУА) з розных рэгіёнаў Беларусі.

Так, заняткі ў ШМЖ праходзяць на базе факультэта ў анлайн- і афлайн-фарматах, відэазапіс якіх выкладваецца на YouTube-канале факультэта, кожную трэцюю суботу месяца з кастрычніка па май. На занятках слухачы знаёмяцца з базавымі прынцыпамі журналістыкі як сацыяльнага інстытута і асобага віду творчай дзейнасці, атрымліваюць пачатковыя веды аб прафесійных метадах работы журналіста, падрыхтоўцы творчых матэрыялаў.

На факультэце журналістыкі БДУ прафарыентацыйная дзейнасць ажыццяўляецца дзякуючы ўзгодненай, зладжанай і спланаванай працы выкладчыкаў- і студэнтаў-валанцёраў. Вядома, што валанцёрства – эфектыўны інструмент для развіцця і росту маладых прафесіяналаў, бо ўдзел у валанцёрскай дзейнасці садзейнічае самарэалізацыі і самаўдасканаленню, дазваляе набыць новыя веды і вопыт, што, бясспрэчна, з'яўляецца важным, а таксама дае магчымасць адчуць сябе сацыяльна значным і карысным. Валанцёрства станоўча ўплывае і на сістэму адукацыі, таму што ўключэнне як маладых выкладчыкаў, так і студэнтаў у гэты від дзейнасці садзейнічае фарміраванню актыўнай жыццёвай пазіцыі, развівае іх навыкі, павышае ўзровень ведаў, падтрымлівае дух патрыятызму [6]. Дзейнасць валанцёраў факультэта прадугледжвае сумесную арганізацыю і правядзенне шматлікіх праектаў, акцый, мерапрыемстваў, сярод якіх – праца студэнтаў-валанцёраў з абітурыентамі ў сацыяльных сетках з выкарыстаннем эфектыўных спосабаў зносін праз розныя інструменты SMM-маркетынгу (інфармацыйныя паведамленні, стварэнне форуму і яго падтрымка, зносіны праз каментарыі ў сацыяльных сетках (Instagram, ВКонтакте, Telegram), падрыхтоўка творчых заданняў для слухачоў ШМЖ і іх праверка, інфармацыйнага кантэнту і яго прасоўванне на сайце журфака і ў сацыяльных сетках, удзел у прафарыентацыйных ініцыятывах факультэта і ўніверсітэта, «суправаджэнне» слухачоў ШМК і ШМЖ ад рэгістрацыі (запаўненне электроннай анкеты слухача школы) на сайце факультэта і да паступлення на факультэт і інш.

У ШМЖ практыкуюцца два сумесныя фарматы ўзаемадзеяння: «студэнт – абітурыент» (накіраваны на ўзаемадзеянне студэнтаў-валанцёраў і школьнікаў-абітурыентаў у ШМЖ і ў сацыяльных сетках, дзе створаны групы і старонкі

для хуткага ўзаемадзеяння і дапамогі абітурыентам) і «студэнт – абітурыент – выкладчык» (накіраваны на развіццё прафесійных навыкаў і ўменняў, падрыхтоўку навуковых даследаванняў школьнікаў у галіне журналістыкі, на іх удзел у круглых сталах, майстар-класах, навуковых канферэнцыях).

Неабходнасць запрашаць навучэнцаў ШМЖ да ўдзелу ў медыяадукацыйных праектах выклікана не толькі тым, што гэта ўнікальная магчымасць для дапрафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў у сферы медыя, але і тым, што сама медыяадукацыя знаходзіцца на мяжы інфармацыйнай і адукацыйнай палітыкі. Так, прафарыентацыйнае выданне «Журпланета абітурыента» рыхтуецца сумесна выкладчыкамі і студэнтамі-валанцёрамі факультэта, кантэнт якога – лепшыя творчыя працы навучэнцаў ДУА, пераможцаў і ўдзельнікаў аглядаў і конкурсаў, што арганізуюцца і праводзяцца ў прафарыентацыйных мэтах на факультэце. Радыё «Культура», напрыклад, у пытаннях медыяадукацыі не абмяжоўваецца працай толькі штатных супрацоўнікаў. Навучэнцы ШМЖ у межах напрамку «На хвалі з абітурыентам» супрацоўнічаюць з куратарамі ад радыё і студэнтамі-валанцёрамі на базе праграмы «ДНК», рыхтуюць уласныя праграмы для эфіраў, што дае ім магчымасць выявіць сябе ў розных жанрах радыёжурналістыкі.

Вопыт сумеснай дзейнасці студэнтаў, школьнікаў, практыкаў і выкладчыкаў дазваляе абітурыентам вызначыцца ў правільнасці выбару будучай прафесіі, далучыцца да вучэбнага і навуковага жыцця факультэта. Як паказвае практыка, менавіта навучэнцы ШМЖ ствараюць канкурэнцыю абітурыентам без спецыяльнай падрыхтоўкі і аказваюцца больш падрыхтаваныя да прафесійнай дзейнасці. Падобныя праекты спрыяюць павышэнню ўзроўню медыяадукаванасці навучэнцаў ШМЖ, рыхтуюць будучых студэнтаў факультэта журналістыкі да прафесійнай дзейнасці яшчэ да паступлення, развіваюць іх творчы патэнцыял. Як слушна адзначае Н. М. Ускова, «дапрафесійная медыяадукацыя будучых спецыялістаў з'яўляецца важным напрамкам, паколькі яе асновы закладваюцца ў навучэнцаў яшчэ да паступлення» [7, с. 7].

Адзначым, што прафарыентацыйны праект «Школа маладога журналіста» і яго шматлікія напрамкі ў штогадовым конкурсе «Лепшы маладзёжны праект БДУ» ў 2022 г. атрымаў дыплом III ступені, а ў 2023 г. – дыплом I ступені.

Акрамя таго, па выніках міжнароднага конкурсу студэнцкіх праектаў «Новыя медыя ў новую эпоху» (г. Алматы, 2023 г.) праект атрымаў дыплом лаўрэата (1-е месца). Думаецца, гэтыя вынікі можна растлумачыць тым, што рашэнне задач у сферы прафарыентацыйнай дзейнасці на факультэце журналістыкі БДУ рэалізуецца ад стварэння мадэлі асобасна-арыентаванага навучання абітурыентаў да развіцця і ўдасканалення зместу іх адукацыі праз:

- выяўленне таленавітых навучэнцаў у галіне журналістыкі, развіццё юнкораўскага руху ў Рэспубліцы Беларусь;
- папулярызацыю прафесіі журналіста і фарміраванне ў навучэнцаў ДУА пачатковых уяўленняў аб працы СМІ;
- стварэнне ўмоў для эфектыўнага фарміравання інфармацыйна-камунікацыйнай культуры і запатрабаванасці ў самарэалізацыі навучэнцаў у галіне журналістыкі;
- грамадзянска-патрыятычнае і духоўна-маральнае выхаванне навучэнцаў праз стымуляванне грамадскіх, творчых і культурных ініцыятыў;
- фарміраванне крытычна думаючай, медыяграматнай асобы, здольнай аргументавана выказваць сваю грамадзянскую пазіцыю;
- стварэнне пазітыўнага іміджу факультэта і ўніверсітэта як вядучага цэнтра падрыхтоўкі журналістаў у Рэспубліцы Беларусь;
- выбудоўванне шматузроўневай сістэмы прафарыентацыйнай дзейнасці ў галіне падрыхтоўкі навучэнцаў ДУА да паступлення на факультэт журналістыкі БДУ.

Журфак праводзіць прафарыентацыйную работу з навучэнцамі ДУА па такіх напрамках, як групавыя і індывідуальныя гутаркі, наведванне лекцый і практычных заняткаў школьнікамі (напрыклад, праект «Студэнт БДУ на тыдзень» праводзіцца два разы на год: у час асенніх і вясновых канікул. Яго ўдзельнікі – вучні 10-га і 11-га класаў – знаёмяцца з універсітэтам, факультэтам, працай Белтэлерадыёкампаніі, рэспубліканскіх медыяхолдынгаў, вучэбным працэсам, разам са студэнтамі наведваюць заняткі і інш.), майстар-класы з выкарыстаннем сучасных тэхналогій, публікацыя матэрыялаў аб факультэце ў друку, выступленні на тэлебачанні, радыё, размяшчэнне інфармацыйных матэрыялаў

у сацыяльных сетках, удзел у выставах СМІ і кірмашах вакансій, правядзенне інфармацыйна-азнаямляльных сустрэч прафесарска-выкладчыцкага складу і студэнтаў са школьнікамі (напрыклад, удзельнікі напрамку «Курс на журфак» – выкладчыкі і студэнты факультэта з прафарыентацыйнай праграмай штогод наведваюць ад 70 да 80 школ, гімназій, ліцэяў па ўсёй рэспубліцы), арганізацыя шматлікіх экскурсій на базе факультэта і ўніверсітэта, размяшчэнне інфармацыйных матэрыялаў у школах, гімназіях, ліцэях, распрацоўка азнаямляльна-інфармацыйнай прадукцыі для абітурыентаў і іх бацькоў і інш. Пры гэтым задача заключаецца не толькі ў тым, каб запрашаць і заклікаць пступаць менавіта на факультэт журналістыкі, але і рабіць гэта ўскосна праз удзел школьнікаў у факультэцкіх мерапрыемствах, а студэнтаў і выкладчыкаў – у школьных мерапрыемствах.

Так, у серыі майстар-класаў («Радыёрэпартаж», «Відэакантэнт для сацыяльных сетак», «Друкаванае выданне ў эпоху цыфравізацыі») адукацыйнага праекта «Канікулы на журфаку» прынялі ўдзел больш за 170 навучэнцаў школ, ліцэяў, гімназій, каледжаў, прадстаўнікоў аб'яднанняў юных журналістаў з розных рэгіёнаў рэспублікі. Удзельнікі праекта даведаліся аб прафесіяналізме сучаснага журналіста, рабоце з друкаваным выданнем, у радыётэлестудыі, аб відэакантэнце для сацыяльных сетак. У межах праекта былі арганізаваны майстар-класы па медыяграматнасці («Пытанні медыяграматнасці ў навучанні журналістаў», «Журналістыка ў лічбавым асяроддзі», «Фэйкавыя» навіны і іх уздзеянне на аўдыторыю») для 40 бацькоў, настаўнікаў, кіраўнікоў гурткоў, клубаў, студый юных журналістаў.

Прафарыентацыйны напрамак «Тыдзень з журфакам», які збірае на працягу тыдня ад 300 да 400 удзельнікаў, праводзіцца ў час вясновых канікул і ўключае сустрэчы з вядомымі медыяасобамі, майстар-класы са спецыялістамі СМІ, а таксама з выкладчыкамі і студэнтамі факультэта, матывацыйныя воркшопы, квэст-гульні.

У рабоце секцыі «Медыядаследаванні юных» навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў БДУ напрамку «Уваходжанне ў навуку» штогод прымаюць удзел ад 12 да 15 навучэнцаў ШМЖ, дзе яны прадстаўляюць свае выступленні з творчымі прэзентацыямі, лепшыя з якіх рэкамендуюцца да друку. Такім чынам было надрукавана 25 матэрыялаў школьнікаў, якімі яны папоўнілі свае партфоліа да паступлення.

Асобны напрамак прафарыентацыйнай дзейнасці – работа з установамі сярэдняй адукацыі, гурткамі, студыямі, цэнтрамі і інш. Так, на сістэматычнай аснове ажыццяўляецца супрацоўніцтва з УА «Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня», ДУА «Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Маяк», студыяй «Таленавітыя дзеці» г. Віцебска, з УА «Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, ліцэем БДУ, УА «Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі», ДУА «Мінскі гарадскі адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Лідар», гурткамі, студыямі, аб'яднаннямі па журналістыцы і інш., для якіх арганізуюцца майстар-класы ад вядомых журналістаў і тэлевядучых, анлайн-вебінары, экскурсіі на базе факультэта, сумеснае правядзенне рэспубліканскіх конкурсаў і акцый.

Так, даволі выніковае і рознабаковае ўзаемадзеянне факультэта журналістыкі БДУ з НДЦ «Зубраня». Гэта арганізацыя і правядзенне анлайн-вебінараў па тэле- і радыёжурналістыцы для ўдзельнікаў журналісцкіх змен, выязных майстар-класаў, удзел выкладчыкаў факультэта ў якасці членаў журы рэспубліканскага конкурсу «Свежы вецер», штогадовае куратарства студэнтамі-валанцёрамі журналісцкіх змен у анлайн- і афлайн-фарматах, дапамога ў падрыхтоўцы друкаванага выдання, радыё- і тэлепраграм. Акрамя таго, для навучэнцаў НДЦ «Зубраня» на базе факультэта арганізуюцца экскурсіі, майстар-класы, творчыя майстэрні па журналістыцы.

Шэраг мерапрыемстваў рэспубліканскага ўзроўню факультэт журналістыкі БДУ арганізуе сумесна з УА «Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, сярод якіх – І Нацыянальны дзіцячы медыяфорум, у якім прымалі ўдзел пераможцы і прызёры рэспубліканскіх конкурсаў юных журналістаў, члены камісій па інфармацыйнай палітыцы падлеткавых парламентаў, прадстаўнікі клубаў, прэс-цэнтраў, тэлестудый і студый журналістыкі ўстаноў адукацыі дзяцей і моладзі. Больш за 100 удзельнікаў медыяфоруму наведалі на факультэце журналістыкі адукацыйныя майстар-класы вядучых

спецыялістаў у галіне журналістыкі, удзельнічалі ў фарсайт-сесіі, сустрэліся з запрошанымі медыйнымі асобамі.

Мэта падобнай працы – уключэнне школьнікаў у студэнцкае жыццё, устанаўленне эмацыянальнай сувязі паміж студэнтамі і выкладчыкамі факультэта і патэнцыяльнымі абітурыентамі, прыцягненне ўвагі мэтавай аўдыторыі да падрыхтоўкі журналістаў ва ўніверсітэце. Як паказвае практыка, для большасці навучэнцаў ДУА падобныя мерапрыемствы з'яўляюцца рашаючымі пры выбары будучай прафесіі.

Ва ўмовах павышанай турбулентнасці знешняга эканамічнага асяроддзя вучням старэйшых класаў неабходна ажыццяўляць выбар будучай прафесіі, і для таго каб гэты выбар быў асэнсаваным, ужо недастаткова даваць інфармацыю аб існуючых прафесіях. Абгрунтаваны выбар прафесіі – гэта асабістае рашэнне школьніка, які ўсведамляе адказнасць за вынік планавання перспектыў уласнага развіцця. Такая адказнасць часам не заўсёды ўласціва нават дарослым, таму выпускнікам на этапе выбару прафесійнага шляху неабходна дапамога педагогаў, бацькоў, псіхолагаў, працадаўцаў. І ў гэтым факультэту журналістыкі дапамагае найперш узгодненая і зладжаная праца, надзейнае шматгадовае ўзаемадзеянне з Міністэрствам інфармацыі, Міністэрствам адукацыі, Мінскім аблвыканкамам, Мінгарвыканкамам, грамадскім аб'яднаннем «Беларускі саюз журналістаў», рэспубліканскімі і рэгіянальнымі СМІ. Традыцыйнымі на факультэце сталі майстар-класы, сустрэчы з прадстаўнікамі Белтэлерадыёкампаніі, а таксама медыяхолдынгаў, друкаваных выданняў, удзел у якіх прымаюць як выкладчыкі, так і студэнты і навучэнцы ШМК і ШМЖ.

Як бачым, прафарыентацыйная работа дапамагае раскрыць талент навучэнцаў, набыць новыя веды, уменні, навыкі, вызначыць для сябе сферу дзейнасці і, канечне, выбраць будучую прафесію. Як лічыў Плутарх, «вучань – гэта не сасуд, які неабходна напоўніць, а факел, які неабходна запаліць».

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Шафранов-Куцев, Г. Ф.* Профориентационные практики в условиях глобализации: социологический анализ / Г. Ф. Шафранов-Куцев, Г. З. Ефимова, М. Ю. Семёнов // Образование и наука. – 2018. – Т. 20, № 8. – С. 46–65.

2. *Королёнок, Л. Г.* Профориентация обучающихся на примере реализации проекта «Школа абитуриента» / Л. Г. Королёнок // Вышэйшая школа. – 2021. – № 1 (141). – С. 33–37.

3. *Ким, М. Н.* Журналистика: методология профессионального творчества / М. Н. Ким. – СПб.: Изд-во Михайлова В. А., 2004. – 496 с.

4. *Ускова, Н. Н.* Профессиональная ориентация и подготовка школьников к получению профессии журналиста / Н. Н. Ускова // Вестник Нижегородского университета имени Н. И. Лобачевского. – 2011. – № 3 (3). – С. 119–123.

5. *Бяляеў, А. В.* Журналіст – прафесія, якая патрабуе служэння / А. В. Бяляеў // Звязда. – 2024. – 6 ліп. – URL: https://zviazda.by/be/news/20240705/1720188832 (дата звароту: 08.07.2024).

6. *Бурчакова, М. А.* Волонтерство как форма проявления социальной ответственности государства, общества и бизнеса / М. А. Бурчакова, В. В. Хожемпо // Современные технологии управления. – 2015. – № 4 (52). – URL: https://sovman.ru/article/5203/ (дата обращения: 02.07.2024).

7. *Бесова, Е. С.* Допрофессиональное медиаобразование и жуналистика / Е. С. Бесова, А. В. Минбалеев // Медиаобразование. – 2008. – № 4. – С. 4–13.

**Анатацыя**

Прафесійнае самавызначэнне – адзін з самых важных этапаў у жыцці чалавека. І на гэтым этапе вялікае значэнне мае скаардынаванае ўзаемадзеянне дзяржаўных устаноў адукацыі, дзяржавы ў цэлым, моладзі, бацькоў. Адным з суб'ектаў прафарыентацыйнай дзейнасці выступае ўстанова вышэйшай адукацыі, яе факультэты. Факультэт журналістыкі БДУ праводзіць прафарыентацыйную работу з навучэнцамі школ, гімназій, ліцэяў і выкарыстоўвае эфектыўныя метады і прыёмы працы з абітурыентамі, накіраваныя на выяўленне творчых якасцей асобы, замацаванне ў навучэнцаў асэнсаванага і матываванага выбару прафесіі журналіста.

**Abstract**

Professional self-determination is one of the most important stages in a person's life. The coordinated interaction of state institutions of education, the state, youth, and parents is of great importance at this stage. One of the subjects of career guidance activity is the institution of higher education and its faculties. The Faculty of Journalism of BSU conducts career guidance work with students of schools, gymnasiums, lyceums and uses effective methods and techniques of working with applicants, aimed at revealing the creative qualities of a person, establishing in students a meaningful and motivated choice of the profession of a journalist.